УДК 342.5(438) DOI 10.52928/2070-1632-2023-65-3-75-78

# ДЗЯРЖАЎНА-ПРАВАВАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ЛЮБЛІНСКАЙ УНІІ 1569 ГОДА

***А.В. ВАЛЕЎКА***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай)***
***ORCID: https://orcid.org/0000-0003-4258-8095***

*У артыкуле разгледжаны асноўныя палажэнні акта Люблінскай уніі 1569 года; дадзена прававая адзнака дзяржаўнай мадэлі Рэчы Паспалітай, згодна са зместам акта Уніі;вызначаны асаблівасці дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай; праведзены аналіз навуковых поглядаў на сутнасць і гісторыка-прававое значэнне Люблінскай уніі; згодна з палажэннямі акта Уніі зроблена выснова аб палітыка-прававым стане Вялікага Княства Літоўскага ў складзе Рэчы Паспалітай.*

***Ключавыя словы**: Люблінская унія, Рэч Паспалітая, Вялікае Княства Літоўскае, сойм.*

**Уводзіны** Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай з'яўляецца аб'ектам даследавання вучоных на працягу доўгага часу. Люблінская унія як дакумент канстытуцыйнага характару мела выключнае значэнне ў працэсе замацавання асноў дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай. Менавіта падрабязнае даследаванне зместу акта уніі дазваляе выявіць асаблівасці Рэчы Паспалітай як дзяржаўнага ўтварэння, а таксама знайсці прычыны тых супярэчнасцей, якія суправаджалі дзяржаву на працягу яе існавання.

**Асноўная частка** Рэч Паспалітая ўзнікла ў выніку пагаднення паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польскім каралеўствам, вядомага як Люблінская унія 1 ліпеня 1569 года (далей – Унія). Унія мела канстытуцыйны характар, вызначаючы асновы палітычнага ладу новай дзяржавы. Гістарычнае значэнне дадзенага дакумента ў розных крыніцах ацэнена па-рознаму.

Некаторыя аўтары разлядалі Унію з негатыўных пазіцый. Напрыклад, І. Лаппо адзначаў, што нягледзячы на замацаваны ў 3 артыкуле акта Уніі прынцып раўнапраўнага аб'яднання Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага, на практыцы гэты прынцып так і не быў рэалізаваны. Сама Унія ў'яўляла сабой фармальны дакумент, які кожны з бакоў імкнуўся выкарыстаць ва ўласных інтарэсах [1, с. 8]. Я. Юхо ў сваіх працах адзначаў, што Унія была навязаная Вялікаму Княству Літоўскаму амаль гвалтоўна і вяла да павелічэння ўплыву Польшчы і паланізацыі мясцовага насельніцтва [2, с. 136]. Нераўнапраўны характар Уніі Я. Юхо падцвярджае фактам адабрання Польшчай некаторых тэрыторый Вялікага Княства Літоўскага з мэтай схілення літоўскага боку да заключэння пагаднення. А. Грыцкевіч адзначаў, што да заключэння Уніі імкнулася шляхта Вялікага Княства Літоўскага, якая на сойме 1562 г. накіравала вялікаму князю просьбу аб заключэнні дзяржаўнай уніі паміж Польшчай і Вялікім Княствам Літоўскім [3, с. 412]. Такім чынам Унія разглядаецца як вынік узаемадзеяння шэрагу аб'ектыўных фактараў. На наш погляд, Унія стала новым этапам у развіцці палітычных і ваенных адносін паміж Польшчай і Вялікім Княствам Літоўскім і з'ўлялася вынікам палітычных імкненняў некалікіх бакоў, аднак гэтая спроба не была дасканалай і не магла пераадолець супярэчнасці, якія існавалі паміж дзвюма дзяржавамі.

Так ці інакш, асновай канстытуцыйна-прававога рэгулявання і ўпарадкавання дзяржаўна-прававых адносін Рэчы Паспалітай стала Унія – дакумент палітычнага і прававога характару, які вызначаў асновы канстытуцыйнага ладу новай дзяржавы, асноўныя прынцыпы ў сістэме ўзаемаадносін асоба – грамадства – дзяржава.

Уступнай часткай акта адзначалася важнасць захавання папярэдніх пагадненняў паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польшчай. У першую чаргу на ўвазе маюцца Крэўская і Гарадзельская уніі, якія былі пачатковымі эпатамі ў развіцці саюзных узаемаадносін паміж дзвюма краінамі. Такім чынам, Люблінская унія павінна была ўмацаваць ужо існуючыя адносіны Вялікага Княства Літоўскага і Польшчы. Таксама важна звярнуць увагу на тое, што акт уніі не ігнараваў прывілеі і граматы, якія былі выдадзены манархамі абедзвюх дзяржаў да моманту заключэння пагаднення. Змест першага артыкула акта Уніі вызначае асноўныя характарыстыкі новай дзяржавы – Рэчы Паспалітай – як адзінай і непадзельнай, утворанай на аснове двух народаў і дзвюх дзяржаваў [4]. Другі артыкул замацоўваў фактычна існуючы на той момант стан манарха: адна асоба для Вялікага Княства Літоўскага і Польшчы. Разам з тым, быў прадугледжаны парадак абрання караля Рэчы Паспалітай агульным галасаваннем прадстаўнікоў Польшчы і ВКЛ. Такім чынам Рэч Паспалітая павінна была стаць выбарнай манархіяй. Зыходзячы са зместу наступнага артыкула, можна зрабіць выснову, што нашчадкі караля таксама мелі права прымаць удзел у выбарах караля ў якасці аднаго з кандыдатаў. Пры іх неабранні гарантавалася матэрыяльная падтрымка з боку дзяржавы. Новаабраны кароль павінен быў падцвердзіць прывілеі і правы саслоў'яў Рэчы Паспалітай. У будучым гэта палажэнне было рэлізавана ў форме актаў «Pacta Conventa», якія абавязкова прымаліся пры абранні караля.

Згодна артыкулу 6 у Рэчы Паспалітай складвалася адзіная прадстаўнічая сістэма, асновай якой павінен быў стаць агульнадзяржаўны сойм. Асабістыя соймы для Вялікага Княства Літоўскага і Польшчы не прадугледжваліся. Гэтае палажэнне таксама было падцверджана ў артыкуле 15. Прадугледжвалася ўзаемападтрымка паміж станамі Вялікага Княства Літоўскага і Польшчы ў палітычных, ваенных, эканамічных і іншых справах.

У Вялікім Княстве Літоўскім, згодна з артыкулам 14, захоўваліся былы адміністрацыйны апарат, асобнае ад Польшчы заканадаўства і судовая арганізацыя, назва дзяржавы «Вялікае княства Літоўскае» і дзяржаўная

пячатка, а таксама войска. Была ўстаноўлена забарона на аднабаковае ўхваленне пагадненняў, саюзаў з іншымі дзяржавамі. Гэта тычылася і ваенных пытанняў. Такім чынам знешняя палітыка Рэчы Паспалітай таксама павінна была стаць адзінай і ўсе рашэнні прымаліся сумесна літоўскім і польскім бакамі. Артыкулы 17 і 18 аб'яўлялі ненарушнасць і недатыкалінасць уласнасці як на тэрыторыі ВКЛ, так і на тэрыторыі Польшчы. Артыкулам 25 была ўстаноўлена адказнасць за парушэнне патрабаванняў уніі. Згодна з ім той, хто парушыў адно з палажэнняў акта уніі, з'уляўся ворагам для дзяржавы і ўсіх станаў.

Акт Уніі замацоўваў сістэму органаў дзяржаўнай улады Рэчы Паспалітай.

Вышэйшым органам улады згодна з артыкулам 15 акта Уніі станавіўся агульны сойм, які мог збірацца на тэрыторыі Польшчы. Асобных соймаў як для Кароны, так і для Княства не прадугледжвалася. Соймы падраздяляліся на звычайныя, што склікаліся каралём, і надзвычайныя. Надзвычайныя соймы мог склікаць кіраўнік каталіцкай царквы ў Рэчы Паспалітай – прымас (арцыбіскуп Гнезненскі) у выпадку смерці караля або яго адмаўлення ад трона [4]. Для выбрання новага караля склікаліся тры соймы: канвакацыйны, элекцыйны і каранацыйны. На канвакацыйным сойме вызначалі час і месца выбараў караля, выпрацоўвалі ўмовы дагавора з кандыдатамі на прастол. На элекцыйным сойме праводзілі выбары і заключалі пагадненне. Урачыстая каранацыя і прысяга караля ажыццяўляліся на каранацыйным сойме. Такім чынам, кажучы «сойм», мы маем на ўвазе не проста заканадаўчы орган, а шырокае паняцце, якое аб'ядноўвае некалькі палітычных інстытутаў. У склад паўнамоцтваў сойма ўваходзілі не толькі пытанні заканадаўчай дзейнасці, але таксама і абранне караля Рэчы Паспалітай, кантроль над дзейнасцю манарха. Таксама сойм меў некаторыя кадравыя паўнамоцтвы выяўленыя ў прызначэнні на пасады вышэйшых службовых асоб. Кампетэнцыя сойма распаўсюджвалася і на судовую дзейнасць. На перыяд працы сойма з ліку дэпутатаў фарміраваўся соймавы суд, які разглядаў найбольш важныя справы. Такім чынам сойм аб'ядноўваў у сабе заканадаўчыя, выканаўчыя і судовыя функцыі.

Па сваёй структуры Сойм быў двухпалатным органам і складаўся з Сената Рэчы Паспалітай і Пасольскай Ізбы. У склад сената ўваходзілі прыдворныя саноўнікі, каталіцкія біскупы, вышэйшыя земскія службовыя асобы – ваяводы і кашталяны. Чальцы сената прызначаліся пажыццёва і фактычна неслі адказнасць толькі перад Рэччу Паспалітай. Першапачаткова ў склад Сената ўваходзілі [5, с. 287]:

– усе сенатары сойма Польскага каралеўства: 2 архібіскупа, 7 біскупаў, 15 ваявод, 17 «старэйшых» і 49 «малодшых» кашталянаў, 5 вышэйшых службовых асоб;

– ад Вялікага Княства Літоўскага: 2 біскупа (віленскі і жамойцкі), 9 ваявод (віленскі, трокскі, смаленскі, полацкі, навагрудскі, віцебскі, берасцейскі, мсціслаўскі і менскі), стараста жамойцкі, 10 кашталянаў (9 ваяводстваў і 10-ты жамойцкі) і 5 вышэйшых службовых асоб (маршалак земскі, канцлер, падканцлер, падскарбі земскі і маршалак дворны);

– ад Каралеўскай Прусіі, якая раней мела ўласныя парламенцкія інстытуты, у Сойм увайшлі 2 біскупа, 3 ваяводы і 3 кашталяна;

– ад тэрыторый, інкарпараваных Каралеўствам Польскім ад Вялікага княства Літоўскага, у Сойм увайшлі 2 біскупа (луцкі і кіеўскі), 4 ваяводы (кіеўскі, валынскі, брацлаўскі і падляшскі) і 4 кашталяна.

Пасля колькасць сенатараў змянялася ў межах ад 140 да 147 [5, с. 288].

Зыходзячы з вышэйпрыведзеных даных, можна зрабіць выснову, што Сенат быў створаны на аснове аналагічнага структурнага падраздзялення Сойма Польскага каралеўства. Вялікае Княства Літоўскае, хоць і ўваходзіла ў Рэч Паспалітую роўным у палітычным стаўленні з Польшчай, аднак мела значна меншае прадстаўніцтва ў вышэйшым органе дзяржаўнай улады.

Першапачаткова ў склад Пасольскай Ізбы ўваходзіла 170 прадстаўнікоў шляхты, з якіх 48 прадстаўлялі Вялікае Княства Літоўскае. Пасля колькасць амбасадараў павялічвалася, галоўным чынам, дзякуючы адміністрацыйна-тэрытарыяльным рэформам, што праводзіліся ў Вялікім Княстве Літоўскам і Польскім каралеўстве [6, с. 405]. Як бачна, прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага тут таксама было недастаткова вялікім.

Перавага польскіх прадстаўнікоў у заканадаўчым органе Рэчы Паспалітай, безумоўна, уплывала на прыняцце дзяржаўна значных рашэнняў у інтарэсах польскага боку. У прыватнасці, праблемы функцыянавання агульнага сойма праявіліся ў самым пачатку існавання Рэчы Паспалітай. У. Падалінскі адзначае, што ўжо 2 ліпеня 1569 г. на Люблінскім сойме ўзнікла спрэчка паміж пасламі Сандамірскага, Калішскага і Трокскага ваяводстваў адносна парадку іх засядання ў палаце Пасольскай ізбы, што паралізавала працу сойма і патрабавала непасрэднага ўдзелу вялікага кароннага маршалка, а пазней – і самаго караля Жыгімонта Аўгуста [8, с. 22]. У выніку быў выдадзены адпаведны каралеўскі ліст, тэкст якога, нажаль, не захаваўся. Тым не менш, іерархія земскіх паслоў была вызначана ў прывілеі ад 11 жніўня 1569 г., а таксама ў дадатковым універсале, ухваленым у той жа дзень. Далейшыя канфлікты паміж польскім і літоўскім бакамі патрабавалі прыняцця дадатковых актаў, якія рэгламентавалі асобныя пытанні дзейнасці сойма.

Шэраг норм Уніі рэгламентаваў прававы статус караля Рэчы Паспалітай. Манарх быў агульны і згодна з артыкулам 2 павінен быў абірацца роўнымі галасамі польскіх і літоўскіх феадалаў [4]. Тытул вялікага князя ўваходзіў у агульны тытул манарха. Згодна з артыкуламі 6 і 15 манарх меў права склікаць надзвычайныя ці пазачарговыя соймы па пытаннях, якія патрабавалі неадкладнага вырашэння. Пазней прававы статус караля Рэчы Паспалітай больш падрабязна рэгламентаваўся актам, які атрымаў назву «Генрыкавы Артыкулы» (далей – «Артыкулы») – назва ад імя першага элекцыйнага караля Генрыха Валуа. Трэба адзначыць, што ў Рэчы Паспалітай склалася традыцыя, што паміж шляхтай і кожным новым каралём перад яго элекцыяй заключалася спецыяльная дамова – так званая pacta conventa, якая вызначала канкрэтныя абавязкі новаабранага манарха і была

своеасаблівым індывідуальным кантрактам. Разам з першай pacta conventa былі складзены і «Артыкулы», у якіх выкладаліся падставовыя прынцыпы шляхецкай дзяржаўнасці. Яны абавязалі караля і вялікага князя прызнаваць вольную элекцыю караля, захоўваць рэлігійны мір, не вырашаць пытанняў вайны і міру без сената і сойма, не праводзіць выбараў наступніка пры сваім жыцці (viventerege), склікаць звычайны сойм кожныя два гады, а таксама прадугледжвалася магчымасць правядзення надзвычайных з'ездаў шляхты. Калі шляхта лічыла, што іх правы парушаюцца, то магла адмовіцца падпарадкоўвацца каралю. «Артыкулы» насілі нязменны характар і кожны абраны кароль абавязаны быў іх пацвердзіць [7, с. 525]. У «Артыкулах» абвяшчаліся свабоднае абранне караля, абавязак склікаць сойм раз у два гады тэрмінам на шэсць тыдняў, не склікаць агульнае апалчэнне (паспалітае рушанне) без згоды сойма [7, с. 525].

Нягледзячы на патрабаванні Уніі аб адзінстве новаўтворанай дзяржавы, фактычна кожная частка канфедэрацыі мела свой асобны адміністрацыйны і судовы апарат, сваю прававую сістэму. Гэты стан быў замацаваны ў Статуце Вялікага Княства Літоўскага 1588 года. Аб гэтым сведчыць змест артыкула 1 першага раздзела «Усе абывацелі Вялікага Княства Літоўскага гэтым адным правам пісаным і ад нас дадзеным павінны быць судзімыя» [9, с. 14], а таксама артыкул 4 трэцяга раздзела «Мы, гаспадар, абяцаем павялічваць Вялікае Княства Літоўскае і, што было забрана і адышло, зноў да яго далучыць» [9, с. 45]. Статутам 1588 г. прадугледжавалася асобная для Вялікага Княства Літоўскага сістэма органаў дзяржаўнага кіравання, парадак іх фарміравання. Такім чынам, юрыдычна Вялікае Княства Літоўскае разглядалася як самастойная дзяржава. Гэтая акалічнасць мела значны ўплыў на ўнутрыпалітычнае становішча дзяржавы. Узаемаадносіны паміж Каронай і Княствам мелі шмат супярэчнасцей. Разам з тым, узмацніўся працэс паланізацыі насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага.

**Заключэнне** Люблінская унія можа разглядацца ў якасці дакумента, які юрыдычна замацаваў імкненні Польшчы і значнай часткі шляхты Вялікага Княства Літоўскага да паглыблення саюзных адносін. Акт Уніі змяшчаў у сабе асноўныя дзяржаўна-прававыя характарыстыкі новага аб'яднання і прадугледжваў менавіта стварэнне адзінай дзяржавы, таму мы можам лічыць яго дакументам канстытуцыйнага характару, палажэнні якога ўдакладнялі наступныя прававыя акты.

Між тым, Унія не вырашала існуючых паміж Польшчай і Вялікім Княствам Літоўскім супярэчнасцей, у першую чаргу тых, якія тычыліся дзяржаўна-прававога стану Вялікага Княства Літоўскага ў складзе Рэчы Паспалітай.

## ЛІТАРАТУРА

1. Лаппо И.И. Великое княжество Литовское за время от заключения Люблинской унии до смерти Стефана Батория (1569–1586). Опыт исследования политического и общественного строя. – СПб.: Тип. И.Н. Скороходова, 1901. – Т. 1. – 811 с.
2. Юхо Я.А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі: вучэб. дапам. – Мінск: Універсітэцкае, 1992. – 270 с.
3. Грыцкевіч А. Люблінская унія 1569 // Энцыкл. гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.). – Мінск: БелЭН, 1997. – Т. 4. – С. 412–413.
4. Акт Люблинской унии 1569 года (текст) [Электронный ресурс]. – URL: https://library.by/portalus/modules/belarus/readme.php?subaction=showfull&id=1141331680&archive=1291800676&start_from=&ucat=&&ysclid=lo5llfr0nt752926280. (дата обращения: 19.09.2023).
5. Сенат Рэчы Паспалітай // Энцыкл. гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 6. Кніга 1: Пузыны – Усая / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭн, 2001. – С. 287-289
6. Вяроўкін-Шэлюта У. Пасольская ізба // Вялікае Княства Літоўскае. Энцыкл. У 2 т. — Мінск: Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2005. — Т. 2: Кадэцкі корпус – Яцкевіч. – С. 404–405.
7. Канаплёва С. Генрыкавы артыкулы // Вялікае Княства Літоўскае: Энцыкл. У 2 т. – Т. 1: Абаленскі – Кадэнцыя / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.). – 2-е выд. – Мінск: БелЭн, 2007. – С. 525.
8. Падалінскі У.А. Прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме 1569 года: удзел у працы першага вальнага сойма Рэчы Паспалітай. – Мінск: А.М. Янушкевіч, 2017. – 240 с.
9. Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. / Пер. на сучас. бел. мову А.С. Шагун. – Мінск: Беларусь, 2016. – 263 с.

*Паступіў 02.11.2023*

## ГОСУДАРСТВЕННО-ПРАВОВАЯ ХАРАКТЕРИСТИКА ЛЮБЛИНСКОЙ УНИИ 1569 ГОДА

***А.В. ВАЛЕВКО***
***(Полоцкий государственный университет имени Евфросинии Полоцкой)***

*В статье рассмотрены основные положения акта Люблинской унии 1569 года, дана правовая оценка государственной модели Речи Посполитой, согласно с содержанием акта Унии, выявлены особенности государственного устройства Речи Посполитой, проведен анализ научных взглядов на суть и историко-правовое значение Люблинской унии; согласно с положениями акта Унии сделан вывод о политико-правовом положении Великого княжества Литовского в составе Речи Посполитой.*

***Ключевые слова**: Люблинская уния, Речь Посполитая, Великое княжество Литовское, сойм.*

## STATE-LEGAL CHARACTERISTICS OF THE UNION OF LUBLIN IN 1569

***A. VALEVKO***
***(Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk)***

*The article examines the main provisions of the act of the Lublin Union of 1569; the legal assessment of the state model of the Commonwealth of Independent States is given, according to the content of the act of union; the features of the state system of the Commonwealth of Independent States are defined; the analysis of scientific views on the essence and historical and legal significance of the Union of Lublin was carried out; according to the provisions of the act of union, a conclusion was made about the political and legal status of the Grand Duchy of Lithuania as part of the Commonwealth of Nations.*

***Keywords****: Union of Lublin, Commonwealth, Grand Duchy of Lithuania, Diet.*